Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________Ю. П. Бондар
«____»_____________2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____/ вуч.

# ГІСТОРЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЯ ТУРЫЗМУ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12*
*Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-04*
*Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*
*(культурная спадчына і турызм)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2016

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Я. Л. Іванова,* выкладчык кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*А. В. Рабава,* дацэнт кафедры педагогікі сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*А. М. Дулаў*, загадчык кафедры гісторыі Беларусі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* гісторыі Беларусі і музеязнаўства ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 01.10.2015);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 29.10.2015)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: Я. Л. Іванова

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

«Гісторыя і арганізацыя турызму» – вучэбная дысцыпліна прызначана для студэнтаў, якія навучаюцца па спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны», напрамку спецыяльнасці «культурная спадчына і турызм». Вучэбная дысцыпліна «Гісторыя і арганізацыя турызму» працягвае цыкл спецыяльных дысцыплін і дае больш дэталёвыя звесткі і практычныя веды ў турыстычнай дзейнасці з улікам прыярытэту развіцця нацыянальнага турызму Рэспублікі Беларусь.

Міждысцыплінарны характар вучэбнай дысцыпліны дазваляе гаварыць аб неабходнасці выкарыстання ведаў іншых навуковых дысцыплін пры выкладанні лекцыйнага матэрыялу і практычных заняткаў. Раскрыццё асноў турыстычнай дзейнасці неабходна для азнаямлення са спецыфікай развіцця міжнароднага і нацыянальнага турызму, асаблівасцямі работы ў сферы турызму. Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» ўлічваецца яе сувязь з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Тэорыя турызму», «Гістарычнае краязнаўства», «Менеджмент і маркетынг у турызме», «Геаграфія турызму» і інш.

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – фарміраванне фундаменту для засваення прафесійных ведаў на аснове вывучэння гісторыі і дасягненняў сусветнага і айчыннага вопыту развіцця турыстычнай дзейнасці.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– даць студэнтам сістэмныя веды аб этапах і заканамернасцях развіцця турыстычнай дзейнасці;

– раскрыць спецыфіку асноўнай прафесійнай дзейнасці турыстычнай сферы;

– выпрацаваць неабходныя практычныя навыкі па апрацоўцы інфармацыі, рабоце з літаратурай і крыніцамі.

Змест вучэбнай дысцыпліны раскрывае гістарычныя ўмовы і асновы сучаснай турыстычнай дзейнасці, а таксама разглядае значныя для арганізацыі работы турыстычных кампаній аспекты дзейнасці, асаблівасці і перспектывы развіцця Беларусі на міжнародным турыстычным рынку.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку засваення вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць:*

– прычыны станаўлення і логіку развіцця турызму;

– практычныя аспекты арганізацыі турыстычнай дзейнасці;

– асаблівасці функцыянавання айчыннай турыстычнай індустрыі.

Студэнты павінны *ўмець:*

– індывідуальна ўсведамляць тэарэтычны і практычны матэрыял;

– карыстацца тэрміналагічным і паняційным апаратам турыстычнай сферы;

– прымяняць на практыцы тэхналогіі арганізацыі нацыянальнага турызму.

Студэнты павінны *валодаць*:

– навыкамі сістэматызацыі атрыманых ведаў;

– уменнем выкарыстоўваць атрыманыя веды на практыцы падчас семінарскіх заняткаў;

– навыкамі індывідуальнай і групавой праектнай работы на занятках.

Пры выкладанні вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» мяркуецца выкарыстоўваць тлумачальна-ілюстрацыйны, даследчы, праблемны і праектны метады навучання.

Самастойная работа студэнтаў накіравана на развіццё аналітычных магчымасцей, пошук неабходнай інфармацыі з навукова-метадычнай літаратуры, газетных публікацый, радыё- і тэлеінфармацыі, інтэрнэт-крыніц. Пры дапамозе выкарыстання метаду кантэнт-аналізу крыніц, прысвечаных актуальным праблемам турыстычнай дзейнасці, кожны студэнт павінен падрыхтаваць рэфераты і самастойныя работы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Гісторыя і арганізацыя турызму» ўсяго прадугледжана 172 гадзіны, з якіх 84 – аўдыторных (52 гадзіны – лекцыйныя, 32 гадзіны – семінарскія).

Рэкамендаваныя формы кантролю – залік і экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семі-нары |
| *Тэма 1.* Уводзіны | 2 | 2 | |
| ***Раздзел 1. Гісторыя падарожжаў і турызму*** | | | |
| *Тэма 2.* Перыядызацыя гісторыі турызму | 2 | 2 | |
| *Тэма 3.* Гісторыя падарожжаў у Старажытным свеце | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 4.* Падарожжы ў эпоху Сярэдневякоўя | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Вандраванні ў эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Падарожжы ў XVIII–XIX стст. | 2 | 2 | |
| *Тэма 7.* Турыстычная індустрыя ў XX–XXI стст. | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 8.* Гісторыя падарожжаў і развіццё турызму ў Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| ***Раздзел 2. Арганізацыя турыстычнай дзейнасці*** | | | |
| *Тэма 9.* Турызм і яго сацыяльна-эканамічныя крытэрыі | 4 | 4 | |
| *Тэма 10.* Сучасныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага турызму | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 11.* Тураператарская і турагенцкая дзейнасць | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 12.* Тэхналогія распрацоўкі і фарміравання тура | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 13.* Распрацоўка, прасоўванне і рэалізацыя турыстычнага прадукту | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 14.* Паслугі размяшчэння і харчавання | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 15.* Транспартныя паслугі ў турызме | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 16.* Турыстычныя фармальнасці, страхаванне, бяспека | 6 | 4 | 2 |
| *Тэма 17.* Экскурсійная дзейнасць і анімацыя | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 18.* Культура і этыка абслугоўвання | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 19.* Псіхалогія ў сферы абслугоўвання | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 20.* Арганізацыя і кіраўніцтва турыстычнай кампаніяй | 4 | 2 | 2 |
| *Тэма 21.* Прававое рэгуляванне турызму ў Рэспубліцы Беларусь | 2 | 2 | |
| **Разам…** | **84** | **52** | **32** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

*Тэма 1. Уводзіны*

Метадалагічныя асновы і прынцыпы вывучэння гісторыі і арганізацыі турыстычнай дзейнасці. Задачы, структура і змест курса. Формы кантролю. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне. Відэаматэрыялы і дакументальныя фільмы пра гісторыю падарожжаў і развіццё турызму. Агульная характарыстыка крыніц і літаратуры.

## Раздзел 1. Гісторыя падарожжаў і турызму

*Тэма 2. Перыядызацыя гісторыі турызму*

Асноўныя паняцці гісторыі турызму: «падарожжа», «турызм», «гасціннасць». Аб'ект і прадмет гісторыі турызму. Гістарыяграфія турызму. Падыходы да вызначэння перыядызацыі гісторыі турызму.

*Тэма 3. Гісторыя падарожжаў у Старажытным свеце*

Матывацыя міграцый першабытных людзей. Развіццё водных і сухапутных транспартных сродкаў. Падарожжы старажытных егіпцян. Сістэма гасціннасці ў Старажытным свеце. Матывацыя падарожжаў у Старажытным Кітаі і іншых усходніх дзяржавах.

Развіццё падарожжаў у эпоху Антычнасці. Матывы і маршруты падарожжаў. Транспартныя сродкі ў Старажытнай Грэцыі і Рыме. Падарожжы на марскіх судах. Сухапутныя перамяшчэнні. Сістэма гасціннасці ў Старажытнай Грэцыі і Рыме.

*Тэма 4. Падарожжы ў эпоху Сярэдневякоўя*

Развіццё транспартных сродкаў і шляхоў. Сістэма гасціннасці: заязныя двары, корчмы, шпіталі. Роля манастыроў у развіцці падарожжаў. Паломніцтва як вядучы від падарожжаў у Сярэдневякоўі. Папулярныя паломніцкія цэнтры Заходняй Еўропы. Роля крыжовых паходаў у развіцці падарожжаў. Матывацыя і напрамкі падарожжаў. Роля гандлю і ваенных паходаў у пашырэнні геаграфіі падарожжаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Тэма 5. Вандраванні ў эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыццяў*

Роля Вялікіх геаграфічных адкрыццяў у пашырэнні геаграфіі падарожжаў. Напрамкі падарожжаў і матывацыя кругасветных падарожжаў. Вялікія вандроўнікі: А. Веспучы, Х. Калумб, Ф. Магелан, В. да Гама, Дж. Кук і інш. Развіццё транспарту і транспартных шляхоў. З'яўленне каравелы і яе роля ў развіцці марскога транспарту. Даследчыя мэты падарожжаў. Роля эпохі ў адкрыцці новых турыстычных шляхоў.

*Тэма 6. Падарожжы ў XVIII–XIX стст.*

Развіццё шляхоў і транспарту. З'яўленне дыліжанса і арганізаваных перавозак пасажыраў. Мэта падарожжа як форма баўлення вольнага часу. Асноўныя напрамкі падарожжаў у эпоху Новага часу. «Гранд-тур» як характэрная асаблівасць падарожжаў Новага часу. Пашырэнне геаграфіі падарожжаў. Саслоўна-элітарны і забаўляльны характар падарожжаў.

*Тэма 7. Турыстычная індустрыя ў XX–XXI стст.*

Турызм як масавая з'ява. Развіццё аўтамабільнага і авіятранспарту і яго ўплыў на якасць і хуткасць падарожжаў. Спорт і турызм у СССР. Уплыў сусветных войнаў на развіццё турызму. Пасляваенныя тэндэнцыі ў развіцці турызму. З'яўленне канцэпцыі сацыяльнага турызму. Развіццё новых напрамкаў у турыстычнай дзейнасці. Міжнародны турызм. Сучасныя тэндэнцыі развіцця турызму і гасціннасці.

*Тэма 8. Гісторыя падарожжаў і развіццё турызму ў Беларусі*

Матывацыя і геаграфія першых падарожжаў. Падарожжы з рэлігійнымі мэтамі. Мода на падарожжа сярод магнатаў Рэчы Паспалітай. Падарожжы з лячэбнымі мэтамі ў Беларусі. Традыцыі гасціннасці на тэрыторыі Беларусі. Роля краязнаўчага руху XIX–XX стст. у развіцці падарожжаў. Савецкі перыяд у развіцці беларускага турызму. Інфраструктура турызму БССР. Сучасныя падыходы развіцця турыстычнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 2. Арганізацыя турыстычнай дзейнасці

*Тэма 9. Турызм і яго сацыяльна-эканамічныя крытэрыі*

Асноўныя паняцці турыстычнай дзейнасці: «турыст», «наведвальнік», «экскурсант», «падарожжа», «тур». Прыкметы турызму. Функцыі турызму: эканамічная, сацыяльная, гуманітарная. Аб'екты і суб'екты турызму. Прафесійны склад турыстычнай арганізацыі. Знешнія і ўнутраныя фактары, якія ўздзейнічаюць на развіццё турызму.

*Тэма 10. Сучасныя тэндэнцыі развіцця міжнароднага турызму*

Фактары і ўмовы развіцця міжнароднага турызму. Прынцыпы і стратэгіі развіцця міжнароднага турызму. Рэкрэацыйна-рэсурсны патэнцыял Рэспублікі Беларусь і асаблівасці яго засваення. Рэгіянальнае развіццё турызму і фактары яго развіцця. Сучасны ўзровень міжнароднай канкурэнтаздольнасці турыстычнага комплексу Беларусі. Прыярытэтныя напрамкі развіцця ўязнога міжнароднага турызму Беларусі.

*Тэма 11. Тураператарская і турагенцкая дзейнасць*

Паняцці «тураператар», «турагент» і «тураператарская дзейнасць» і «турагенцкая дзейнасць». Асноўныя функцыі турыстычных арганізацый і напрамкі іх дзейнасці. Класіфікацыя тураператараў. Спецыфіка тураператарскай і турагенцкай дзейнасці. Буйнейшыя тураператары Беларусі і іншых краін. Дзейнасць айчынных турыстычных кампаній.

*Тэма 12. Тэхналогія распрацоўкі і фарміравання тура*

Разуменне турыстычнага прадукту як комплексу турыстычных паслуг. Фактары вытворчасці турыстычнага прадукту. Этапы распрацоўкі турыстычнага прадукту. Даследаванне турыстычнага рынку. Жыццёвы цыкл турпрадукту. Эксперыментальная праверка тура. Тэхналагічная дакументацыя. Фарміраванне асноўнага і дадатковага комплексу паслуг. Дзяржаўнае рэгуляванне якасці турыстычна-экскурсійнага абслугоўвання.

*Тэма 13. Распрацоўка, прасоўванне і рэалізацыя турыстычнага прадукту*

Стратэгіі прасоўвання тура. Забеспячэнне якасці турыстычнага прадукту. Маркетынгавыя камунікацыі ў рэалізацыі тура.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэсурсы, неабходныя для рэалізацыі турыстычнага прадукту. Выставачная дзейнасць турыстычных прадпрыемстваў. Стымуляванне збыту, рэкламная дзейнасць і сувязь з грамадскасцю.

*Тэма 14. Паслугі размяшчэння і харчавання*

Тыпалогія атэляў. Класіфікацыя атэляў (па месцазнаходжанні, забеспячэнні харчаваннем, узроўню кошту, узроўню камфорту, па прызначэнні). Перавагі атэльных сетак. Асноўныя і дадатковыя паслугі атэляў. Формы супрацоўніцтва тураператараў і атэльных прадпрыемстваў.

Класіфікацыя прадпрыемстваў харчавання. Умовы харчавання ў рэстаранах атэльных комплексаў. Метады абслугоўвання ў індустрыі харчавання. Кейтэрынг.

*Тэма 15. Транспартныя паслугі ў турызме*

Класіфікацыя транспартных сродкаў. Паветраны транспарт у турызме. Формы ўзаемадзеяння турыстычных арганізацый і авіякампаній. Водны транспарт у турызме. Асаблівасці арганізацыі круізаў. Чыгуначны транспарт у турызме. Турысцка-экскурсійныя цягнікі. Доўга- і кароткатэрміновыя аўтобусныя перавозкі турыстаў. Аўтамабільныя падарожжы ў турызме. Паслуга арэнды аўтамабіля. Камбінаваныя туры. Забеспячэнне камфорту і бяспекі турыстаў падчас паездкі.

*Тэма 16. Турыстычныя фармальнасці, страхаванне, бяспека*

Сутнасць і віды турыстычных фармальнасцей. Дакументы турыстычных кампаній і працэдура іх афармлення. Дзейнасць міжнародных арганізацый па спрашчэнні турыстычных фармальнасцей. Пашпартна-візавыя фармальнасці. Віды віз. Асаблівасці афармлення віз для наведвання краін Шэнгенскай зоны. Мытныя фармальнасці: сутнасць, асноўныя характарыстыкі. Дэкларацыя тавараў. Санітарныя фармальнасці ў турызме. Бяспека турыстаў як важнейшы прынцып арганізацыі турызму. Класіфікацыя і віды страхавання ў турызме.

*Тэма 17. Экскурсійная дзейнасць і анімацыя*

Арганізацыя экскурсійнага абслугоўвання. Сутнасць, структура і класіфікацыя экскурсій. Сектар анімацыйнай дзейнасці ў турызме. Арганізацыя вольнага часу турыстаў у атэлях. Забеспячэнне культурна-пазнавальнымі і забаўляльнымі праграмамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сусветна вядомыя забаўляльныя цэнтры, атракцыёны, тэматычныя паркі. Забеспячэнне дзіцячага адпачынку.

*Тэма 18. Культура і этыка абслугоўвання*

Этычныя прынцыпы, закладзеныя ў падмурак сферы абслугоўвання. Прафесійная этыка работнікаў турыстычнай індустрыі. Кодэкс прафесійнай этыкі работнікаў сферы абслугоўвання. Прафесійныя паводзіны работніка турыстычнай сферы. Карпаратыўная этыка. Культура зносін і абслугоўвання.

Паняцце камунікатыўнай кампетэнтнасці спецыяліста турыстычнай індустрыі. Асобасныя якасці і неабходныя веды, уменні, навыкі спецыяліста ў галіне турыстычнага бізнесу.

*Тэма 19. Псіхалогія ў сферы абслугоўвання*

Прафесійныя і псіхалагічныя аспекты работы ў турыстычнай індустрыі. Асноўныя якасці прафесійнай культуры менеджара турфірмы. Тактыка і тэхналогія абслугоўвання кліентаў. Культура абслугоўвання кліентаў у офісе. Абслугоўванне падчас паездак і экскурсійных праграм. Скаргі і канфлікты пры абслугоўванні кліентаў і шляхі іх вырашэння. Прафесійныя стасункі і правядзенне перамоў з партнёрамі.

*Тэма 20. Арганізацыя і кіраўніцтва турыстычнай кампаніяй*

Арганізацыя і кіраванне турыстычным прадпрыемствам. Напрамкі рацыянальнай арганізацыі працы менеджара турфірмы. Укараненне камп'ютарных інфармацыйных тэхналогій. Прафесійныя абавязкі агента, менеджара, кіраўніка турыстычнай кампаніі. Стварэнне спрыяльных умоў працы супрацоўнікаў. Патрабаванні да арганізацыі працоўнага месца супрацоўнікам турыстычнай кампаніі.

*Тэма 21. Прававое рэгуляванне турызму ў Рэспубліцы Беларусь*

Турыстычная палітыка: сутнасць і асноўныя функцыі. Сістэма кіравання індустрыяй турызму ў Беларусі. Міжнароднае заканадаўства ў індустрыі турызму. Манільская дэкларацыя па сусветным турызме (1980), Хартыя турызму (1985), Гаагская дэкларацыя па турызме (1989), Глабальны этычны кодэкс турызму (1999), Квебекская дэкларацыя па экатурызме (2002). Нарматыўна-прававое забеспячэнне рэгулявання турыстычнай дзейнасці. Асноўныя палажэнні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб турызме» (2010). Стандартызацыя і сертыфікацыя ў турызме.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Березовская, Л. Г.* История туризма и гостеприимства / Л. Г. Березовская. – М. : Юрайт, 2014. – 477 с.

2. *Грицкевич, В. П.* История туризма в древности / В. П. Грицкевич. – СПб. : Герда, 2005 – 336 с.

3. *Дулов, А. Н.* История путешествий и туризма : монография / А. Н. Дулов, К. А. Дюхова, Д. В. Юрчак. – Витебск : УО «ВГУ им. П. М. Машерова», 2011. – 139 с.

4. *Дурович, А. П.* Организация туризма : учеб. пособие / А. П. Дурович. – Минск : Совр. школа, 2010. – 383 с.

5. *Дурович, А. П.* Продвижение туристского продукта на рынок / А. П. Дурович. – Минск : БГЭУ, 2008. – 186 с.

6. *Квартальнов, В. А.* Туризм: учебник / В. А. Квартальнов. – М. : Финансы и статистика, 2007. – 336 с.

7. *Матюхина, Ю. А.* Организация туристской индустрии : учеб. пособие / Ю. А. Матюхина. – М. : Альфа-М : ИНФРА-М, 2011. – 304 с.

8. Организация туризма : учеб. пособие / А. П. Дурович, Н. И. Кабушкин, Т. М. Сергеева [и др.] ; под общ.ред. Н. И. Кабушкина. – Минск : Новое знание, 2003. – 632 с.

9. *Соколова, М. В.* История туризма : учеб. пособие для студентов учрежд. высш. проф. обр. / М. В. Соколова. – 7-е изд., испр. – М. : Изд. центр «Академия», 2012. – 352 с.

10. *Шаповал, Г. Ф.* История туризма / Г. Ф. Шаповал. – 2-е изд. – Минск : РИВШ : БГУ, 2002. – 256 с.

*Дадатковая*

1. *Бгатов, А. П.* Безопасность в туризме : учеб. пособие / А. П. Бгатов. – М. : Форум, 2012. – 176 с.

2. *Биржаков, М. Б.* Индустрия туризма: перевозки / М. Б. Биржаков, В. И. Никифоров. – М. : Герда, 2001. – 268 с.

3. *Власова, Т. И.* Профессиональное деловое общение в сфере туризма : учеб. пособие для вузов / Т. И. Власова, А. П. Шарухин, М. М. Данилова. – М. : Академия, 2007. – 256 с.

4. *Грачева, О. Ю.* Организация туристического бизнеса: технология создания турпродукта : учеб.-практ. пособие /

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

О. Ю. Грачева, Ю. А. Маркова, Л. А. Мишина, Ю. В. Мишунина. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Дашков и К, 2012. – 276 с.

*5. Долженко, Г. П.* История туризма в Российской империи, Советском Союзе и Российской Федерации / Г. П. Долженко, Ю. С. Путрик. – М. ; Ростов н/Д : Феникс : МарТ, 2010. – 301 с.

*6.* Закон Республики Беларусь «О туризме», 16 июня 2010 г. // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2010. – № 139. – 13 с.

*7. Зорин, И. В.* Туризм как вид деятельности / И. В. Зорин [и др.]. – М. : Финансы и статистика, 2005. – 286 с.

*8. Кусков, А. С.* Основы туризма / А. С. Кусков, Ю. А. Джаладян. – М. : КноРус, 2008. – 387 с.

*9. Новиков, В. С.* Организация туристической деятельности : учебник для студентов учрежд. высш. проф. обр. / В. С. Новиков. – М. : Академия, 2013. – 336 с.

*10. Рындач, М. А.* Основы туризма : учеб. пособие / М. А. Рындач ; под ред. С. Н. Смоленского. – М. : Дашков и К ; Ростов н/Д, 2015. – 204 с.

*11. Сенин, В. С.* Организация международного туризма : учебник / В. С. Сенин. – М. : Финансы и статистика, 2004. – 213 с.

*12.* Туризм в Беларуси / Л. М. Гайдукевич, А. И. Тарасенок, Д. Г. Решетников, Н. И. Полещук ; Белорус. гос. ун-т, фак. междунар. отношений, каф. междунар. туризма. – Минск : БГУ, 2001. – 131 с.

*13.* Туристская энциклопедия Беларуси / З. Я. Андриевская [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл., 2007. – 647 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па гісторыі і сучасным развіцці турыстычнай дзейнасці, а таксама асаблівасцей яе арганізацыі.

Для дыягностыкі кампетэнцыі студэнтаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў:

– праектная работа студэнтаў па асобных раздзелах і дысцыпліне ў цэлым;

– пісьмовыя заданні па асобных раздзелах дысцыпліны;

– выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па распрацаваных імі тэмах;

– падрыхтоўка і абарона рэфератаў.

Выніковая ацэнка кампетэнцыі прадугледжвае правядзенне экзамену.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

– фарміраванне ўменняў па аналізе розных відаў інфармацыі;

– якаснае засваенне і сістэматызацыю атрыманых тэарэтычных ведаў;

– фарміраванне ўмення выкарыстоўваць атрыманыя веды ў рабоце ўстаноў турыстычнай сферы;

– замацаванне практычных уменняў студэнтаў;

– фарміраванне самастойнай думкі;

– развіццё навукова-даследчых навыкаў.

## Кантроль самастойнай работы студэнтаў здзяйсняецца шляхам:

– напісання студэнтамі рэфератаў, заданняў па асобных раздзелах курса;

– пісьмовага аналітычнага абзору дадатковых крыніц і літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

| | |
|---|---|
| **1 бал** – *нездавальняюча* | адзнака ставіцца, калі студэнт адмовіўся ад адказу ці спроба адказу цалкам не адпавядае зместу прапанаваных студэнту пытанняў або студэнт зусім не валодае вучэбным матэрыялам |
| **2 балы** – *амаль здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які мае істотныя прабелы ў ведах, не арыентуецца ў спецыялізаваных тэрмінах і паняццях, не валодае асноўнымі паняццямі турыстычнай сферы, не засвоіў большую частку праграмнага матэрыялу, а таксама ў выпадку пропускаў і неадпрацоўцы семінарскіх заняткаў, невыкананні заданняў па самастойнай рабоце |
| **3 балы** – *здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які ведае частку вучэбнага матэрыялу, вельмі слаба арыентуецца ў асноўных турыстычных паняццях, не ведае гістарычных перыядаў развіцця турызму, не вызначыўся актыўнасцю і зацікаўленасцю курсам на семінарскіх занятках, а таксама пры выкананні самастойных і кантрольных работ, няпоўнасцю адпрацаваў практычныя заняткі |
| **4 балы** – *дастаткова здавальняюча* | адзнака ставіцца студэнту, які неглыбока валодае асноўным вучэбным матэрыялам, слаба арыентуецца ў асноўных паняццях у турыстычнай галіне, не ведае або блытаецца ў гістарычных этапах развіцця турызму і слаба валодае асноўнымі фактамі, звязанымі з развіццём турызму на сучасным этапе, а таксама не праяўляў актыўнасць на семінарскіх занятках, але атрымаў станоўчую адзнаку за выкананне заданняў па курсе |
| **5 балаў** – *амаль добра* | заслугоўвае студэнт, які ў асноўным засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, самастойна выконваў заданні, але дапусціў пры іх выкананні памылкі, не вельмі добра валодае праграмным матэрыялам, дапускае недакладнасці пры выкарыстанні асноўных па- |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | няццяў турыстычнай індустрыі, не вельмі добра разбіраецца ў асаблівасцях арганізацыі турыстычных паслуг, пры адказе дапускае памылкі і няпоўна раскрывае пытанні, на семінарскіх занятках не праявіў значнай актыўнасці |
| **6 балаў** – *добра* | заслугоўвае студэнт, які дастаткова ведае вучэбны матэрыял па праграме, засвоіў праграмны матэрыял, пры адказе карыстаецца асноўнымі паняццямі і тэрмінамі, ведае гістарычныя аспекты развіцця турызму і асаблівасці дзейнасці турыстычных прадпрыемстваў, таксама прымаў удзел у семінарскіх занятках, выканаў неабходныя заданні, атрымаўшы станоўчыя адзнакі, але пры адказе на пытанні дапускае недакладнасці і неістотныя памылкі |
| **7 балаў** – *вельмі добра* | заслугоўвае студэнт, які трывала і грунтоўна ведае вучэбны матэрыял па праграме, карыстаецца прафесійнай лексікай, добра разбіраецца ў спецыфіцы развіцця і арганізацыі турыстычнай індустрыі ў Беларусі і свеце, выкарыстоўвае свае веды падчас актыўнага ўдзелу на семінарскіх занятках, а таксама своечасова выканаў усе заданні і атрымаў добрыя адзнакі, аднак у адказе дапусціў нязначныя памылкі |
| **8 балаў** – *амаль выдатна* | заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне вучэбнага матэрыялу па праграме, на пытанні адказвае добра з валоданнем тэрміналогіі і сутнасці пытання, добра разбіраецца ў міжнародных тэндэнцыях развіцця турызму, апеліруе фактамі і дадатковай інфармацыяй у турыстычнай галіне, а таксама пры падрыхтоўцы да заняткаў карыстаўся асноўнай літаратурай, рэкамендаванай у праграме, самастойна і своечасова выканаў усе заданні, праявіў актыўнасць на семінарскіх занятках |
| **9 балаў** – *выдатна* | заслугоўвае студэнт, які поўна і сістэмна засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, пры |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | адказе дэманструе грунтоўныя веды і веданне матэрыялу, выкарыстоўваючы прыклады і дадатковую інфармацыю пры адказе, разумее асноўныя аспекты прафесійнай дзейнасці ў турыстычнай галіне, самастойна і на высокім узроўні выканаў усе віды заданняў па курсе, а таксама актыўна ўдзельнічаў на семінарскіх занятках, карыстаўся дадатковымі крыніцамі інфармацыі |
| **10 балаў** – *надзвычайна выдатна* | заслугоўвае студэнт, які поўна, сістэмна і глыбока засвоіў вучэбны матэрыял па праграме, прадэманстраваў грунтоўныя веды і веданне прафесійнага матэрыялу па гісторыі развіцця турызму, выдатна арыентуецца ў аспектах арганізацыі турыстычных паслуг і тураў, тэндэнцыях развіцця нацыянальнага і міжнароднага турызму, карыстаўся асноўнай і дадатковай літаратурай пры выкананні самастойных заданняў, а таксама самастойна, своечасова і на высокім узроўні выканаў усе заданні, выдатна рыхтаваўся і бліскуча выступаў на семінарскіх занятках |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ І АРГАНІЗАЦЫЯ ТУРЫЗМУ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,99. Ул.-выд. арк. 0,62. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ